Л.М.Рагачова,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА Ў СІСТЭМЕ КОМПЛЕКСНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ МАСТАЦКІХ ДЫСЦЫПЛІН

Дынаміка сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве, значна ўзвысіла ролю суб'ектыўнага фактару ва ўсіх сферах жыцця. Менавіта ён выконвае ролю моцнага стымулу ў трансфармацыі сучаснага грамадства. Роля асобаснага фактару значная для педагагічнай дзейнасці. Яна ўтрымлівае ў сабе шырокія магчымасці для духоўнага станаўлення новых пакаленняў.

Як вядома, педагагічная дзейнасць сваёй вышэйшай мэтай згадвае стварэнне аптымальных умоў для фарміравання сацыяльнага чалавека, суб'екта сацыяльных зносін і розных відаў дзейнасці, які глыбока ўсведамляе сутнасць гэтых працэсаў і актыўна ўдзельнічае ў іх рэалізацыі. Здзяйсненне гэтых мэт знаходзіцца ў прама прапарцыянальнай залежнасці ад эфектыўнасці і якасці функцыянавання ўсіх складаючых сістэм адукацыйна-выхаваўчых інстытутаў, іх здольнасці значна ўзвысіць інтэлектуальна-творчы і прафесійна-кваліфікаваны патэнцыял грамадства і, зразумела, у першую чаргу, ад дзейнасці педагога.

Разам з тым спецыфічнасць педагагічнай дзейнасці заключаецца ў тым, што яна заўсёды носіць суб'ект-суб'ектны характар, што абумоўлівае высокі ўзровень патрабаванняў да асобы настаўніка, яе агульнага развіцця ў спалучэнні з высокім прафесіяналізмам. Агульнае ў развіцці асобы характарызуецца ўсебаковасцю і гарманічнасцю асноўных кампанентаў псіхалагічнай структуры асобы. Прафесійнае ж выяўляецца ў імкненні і гатоўнасці рэалізаваць сябе ў выбранай сферы дзейнасці, у набыцці сістэмы адпаведных ведаў, уменняў, навыкаў, неабходных для яе высокай эфектыўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З пункту гледжання цэласнага падыходу да фарміравання асобы педагога, гэтыя кампаненты знаходзяцца ва ўзаемадзеянні. Кожнае парушэнне гэтага адзінства вядзе да агульнага зніжэння развіцця асобы, таму што замыканне на вузкапрафесійнай сферы (дзейнасна-функцыянальны падыход) вядзе да збяднення светаўспрымання, а арыентацыя толькі на агульнае развіццё (дзейнасна-асобасны падыход) звужае магчымасці для творчай прафесійнай дзейнасці.

У сувязі з адзначаным адной з важнейшых задач у падрыхтоўцы педагагічных кадраў для сферы культуры і мастацтва з'яўляецца стварэнне комплекснай, збалансаванай, непарыўнай і мэтанакіраванай сістэмы фарміравання педагогаў-прафесіяналаў.

Як вядома, педагагічнае майстэрства выяўляецца ў высокім узроўні арганізацыі і самакіравання педагагічнай дзейнасцю суб'екта, уменні канкрэтызаваць агульнасацыяльныя задачы фарміравання творчай, гарманічна развітой асобы ў прыватныя задачы, формы, метады работы, якія забяспечваюць індывідуальны падыход да развіцця асобы вучня. Абавязковымі кампанентамі такога прафесіяналізму, на думку сучасных аўтараў (Н.В.Кузьміна, І.А.Зязюн, В.А.Сласцёнін і інш.), з'яўляюцца гуманістычная накіраванасць дзейнасці педагога, глыбіня і шырыня яго прафесійных ведаў (г.зн. прадмета выкладання), развітыя педагагічныя здольнасці, агульная эрудыцыя і культура, педагагічная тэхніка.

Працэс фарміравання прафесійных якасцей будучых педагогаў складаецца з двух накірункаў: засваення шырокага блоку агульнанавуковых ведаў, найноўшых дасягненняў псіхолага-педагагічных і спецыяльных навук, а таксама авалодання сістэмай уменняў і навыкаў, іх практычнай рэалізацыяй у розных тыпах вучэбна-выхаваўчых устаноў. Шматгадовы вопыт сведчыць, што сапраўднае майстэрства настаўніка вынікае з арганічнага адзінства гэтых накірункаў, што дазваляе комплексна ажыццяўляць метадалагічную, тэарэтычную і тэхналагічную падрыхтоўку будучых педагогаў. Паслядоўнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

засваенне студэнтамі філасофскіх, псіхолага-педагагічных дысцыплін, вывучэнне агульнаметадычных заканамернасцей і прынцыпаў выкладання прадметаў мастацкага цыкла стварае неабходныя падставы для перанясення тэарэтычных палажэнняў у практыку, у рэальную педагагічную рэчаіснасць у працэсе наступнага этапу падрыхтоўкі — педагагічнай практыкі. Такім чынам, веды засвойваюцца не абстрактна, а ў дынаміцы прафесійнага станаўлення будучага педагога. Практыка ў агульнанавуковым сэнсе разглядаецца як матэрыяльная, пачуццёва-прадметная мэтанакіраваная дзейнасць чалавека, крытэрый сапраўднасці. (Гл.: Педагагічная практыка студэнтаў: Вуч. дапам. /Пад рэд. В.П.Таранцея. Мн., 1991. С.26.) Яна дазваляе студэнту адчуць як складанасць педагагічнага працэсу, так і ўбачыць магчымасць для плённай творчай дзейнасці, ідэнтыфікаваць сябе з прафесійным настаўнікам.

Склаўшаяся ва універсітэце культуры сістэма падрыхтоўкі педагогаў для сферы культуры і мастацтва дазваляе выдзяліць шэраг этапаў:

1) этап авалодання будучымі спецыялістамі светапогляднымі і метадалагічнымі ведамі, выпрацоўка цэласнага навуковага светаўспрымання. Рэалізацыя гэтых задач ажыццяўляецца ў працэсе вывучэння студэнтамі цыкла грамадскіх і псіхолага-педагагічных навук, якая ў асноўным ажыццяўляецца на пачатковых курсах навучання;

2) этап паглыбленага вывучэння канкрэтных методык выкладання спецыяльных дысцыплін (III — V курсы навучання);

3) этап фарміравання педагагічных уменняў і навыкаў, забеспячэння адзінства тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, што адбываецца ў працэсе педагагічнай практыкі на працягу IV — V курсаў навучання.

У адзінстве і ўзаемадзеянні гэтыя ступені падрыхтоўкі маюць на ўвазе стварэнне неабходных умоў для фарміра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання педагагічнага мыслення будучых выкладчыкаў як функцыянальнага пачатку, асновы педагагічных адносін да рэчаіснасці. Разам з тым, на наш погляд, склаўшаяся сістэма губляе адзін з важнейшых фактараў станаўлення педагога — ранейшае далучэнне студэнтаў да педагагічнай спецыялізацыі. Педагагічная прафесія мае адметную рысу: яна патрабуе больш працяглага ўваходжання ў педагагічную рэчаіснасць, глыбокага асэнсавання сябе як суб'екта станаўлення іншага чалавека, яго непаўторнай індывідуальнасці. Таму неабходна ўвесці ўжо на першым годзе навучання спецыяльны курс "Уводзіны ў педагагічную спецыяльнасць". Метадалагічна важна, каб фарміраванне матывацыйна-каштоўнасных адносін да сістэмы псіхолага-педагагічных ведаў, разуменне іх значнасці не толькі для сацыяльнага прагрэсу, але і для ўласнай самарэалізацыі пачыналася з самага пачатку навучання студэнта ў ВНУ. Пазітыўны уплыў дадзенага курса на фарміраванне прафесійна-педагагічнай накіраванасці асобы студэнта будзе здзяйсняцца не толькі ў працэсе засваення псіхолага-педагагічных навук, але таксама праз змест, формы, метады і прыёмы выкладання іншых дысцыплін, праз глыбокае засваенне мэт і задач прафесійна-педагагічнай дзейнасці, жаданне актыўна ўдасканальваць свае веды і ўменні для будучай педагагічнай практыкі.

Асаблівая ўвага ў комплекснай падрыхтоўцы педагогаў павінна быць удзелена засваенню студэнтамі метадычных асноў арганізацыі выхаваўчай работы з прадстаўнікамі розных узроставых груп. Адукацыя — гэта не толькі і не столькі атрыманне ведаў. Гэта працэс тварэння чалавека. Гэта фарміраванне яго духоўнага свету, яго унікальнасці, а не толькі інтэлекту (гл.: *Латыш Н.И.* Образование на рубеже веков. Мн., 1994. С.7). Таму дадзеная галіна педагагічных ведаў у пэўнай ступені разглядаецца ў курсах "Педагогіка", "Узроставая псіхалогія" , у спецкурсах "Псіхолага-педагагічныя асновы эстэтычнага выхавання асобы", "Сучасныя праблемы фарміравання творчай асобы" і інш. Але ўлічваючы той

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

факт, што адзначаныя спецкурсы выкладаюцца не для ўсіх студэнтаў (у асноўным для бакалаўраў), да таго ж носяць вузка праблемную накіраванасць, асноўная маса студэнтаў не атрымлівае неабходных ведаў па арганізацыі мэтанакіраванай выхаваўчай работы. Без разумення педагогам уплыву зместу, метадаў, формаў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу на фарміраванне актыўнасці, свядомасці, самастойнасці і ініцыятывы вучня немагчымы прадукцыйны выхаваўча-адукацыйны працэс, а значыць, і станаўленне педагога. Аснову такога разумення выхаваўчай работы педагога вызначае курс "Методыка выхаваўчай работы", які павінен увесці студэнтаў у складаную сістэму выхавання падрастаючага пакалення.

Сучасная рэформа школы адной з вядучых задач у адукацыі вылучае перанясенне акцэнту з простага засваення школьнай праграмы на дасягненне рознабаковага развіцця кожнага вучня. Гэтая гуманістычная накіраванасць сістэмы адукацыі патрабуе пабудовы ўсяго педагагічнага працэсу на аснове суб'ект-суб'ектных узаемадзеянняў паміж настаўнікам і вучнем, што ў сваю чаргу патрабуе значнага развіцця асобасных і прафесійных якасцей будучых настаўнікаў. Дапамогу ў ажыццяўленні такога напрамку комплекснай падрыхтоўкі спецыяліста павінен аказаць курс "Асновы педагагічнага майстэрства", які ў значнай ступені складаецца з трэнінгавых заняткаў і спецпрактыкумаў. Найбольш аптымальна такі спецкурс увесці ў перыяд праходжання актыўнай педагагічнай практыкі. Спалучэнне тэарэтычных ведаў і шматграннага вопыту практычнай дзейнасці педагогаў розных вучэбна-выхаваўчых устаноў (баз практыкі), пры мэтанакіраваным кіраўніцтве выкладчыка дадзенага курса, дае магчымасць студэнтам творча ўспрымаць матэрыял, мадэліраваць асобасны почырк у педагагічнай дзейнасці. Такім чынам, прафесійна-педагагічнае станаўленне спецыяліста будзе ажыццяўляцца на падставе прынцыпаў паслядоўнасці, бесперапыннасці і комплекснасці. У кантэксце такога падыходу мэтазгодна перагледзець і тэрмін праходжання студэнтамі педага-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гічнай практыкі. Логіка фарміравання прафесійна-педагагічных якасцей выпускнікоў, а таксама вопыт вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі і СНД сведчаць аб неабходнасці ўвядзення паралельна з тэатральнай падрыхтоўкай бесперапыннай педагагічнай практыкі, пачынаючы з малодшых курсаў навучання, што забяспечыць паслядоўнае ўключэнне студэнтаў у педагагічную дзейнасць, якая паступова ўскладняецца.

Магчымым варыянтам арганізацыі педагагічнай практыкі студэнтаў Беларускага універсітэта культуры можа быць наступны:

I курс — правядзенне азнаямленчай практыкі, у ходзе якой ажыццяўляецца знаёмства студэнтаў з сучасным станам вучэбна-выхаваўчай работы ў вучэбных і выхаваўчых установах, з асноўнымі функцыямі настаўніка, кіраўніка творчага калектыву, з планаваннем вучэбна-выхаваўчай работы, вывучэннем школьнай дакументацыі.

II курс — вывучэнне зместу дзейнасці ўсіх структурных адзінак вучэбна-выхаваўчай установы, аналіз вопыту падрыхтоўкі і правядзення пазакласных мерапрыемстваў, засвойванне прыёмаў і метадаў укаранення індывідуальнага падыходу да вучня і інш.

III курс — наведванне заняткаў выкладчыкаў, выконванне заданняў па вывучэнні методыкі падрыхтоўкі настаўніка да заняткаў па прадмеце, самастойнае вылучэнне мэт і задач, знаходжанне сродкаў і метадаў іх вырашэння і інш.

IV курс — непасрэднае далучэнне студэнтаў да педагагічнай дзейнасці, калі ажыццяўляецца педагагічны аналіз як уласных урокаў, так і заняткаў іншых студэнтаў. Студэнты вылучаюць аб'екты псіхолага-педагагічнага вывучэння вучняў, прымаюць удзел у пасяджэннях педагагічных саветаў, метадычных аб'яднанняў і інш.

V курс — актыўнае ажыццяўленне сістэмы вучэбна-выхаваўчых заняткаў, арганізацыі цэласнага вучэбна-выхаваўчага працэсу ў канкрэтным калектыве ці класе, складанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі калектыву, распрацоўка і правядзенне факультатыўных заняткаў і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Безумоўна, выдзяленне названых этапаў практычнага засваення педагагічнай спецыяльнасці патрабуе больш грунтоўнага падыходу да зместу кожнага з іх. Але з пункту гледжання паслядоўнасці, сістэмнасці, паступовага ўскладнення заданняў арганізацыя бесперапыннай педагагічнай практыкі стварае больш спрыяльныя ўмовы для фарміравання прафесійна-педагагічнага мыслення, пабуджае да максімальнай асабістай адказнасці і актыўнасці.

**А.У.Рыбчынская,**
**ст.выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## НОВЫЯ ФОРМЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ПЕРЫЯД ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ

Праблема арганізацыі педагагічнай і вытворчай практыкі ўзнікае на той момант, калі ў ВНУ паступае студэнт. Здаецца, проста размеркаваць студэнтаў па школах, якіх вялікая колькасць і якія прагнуць атрымаць творчага спецыяліста, асабліва ў галіне харэаграфіі, музыкі, харавога мастацтва, сацыяльнага педагога, па Дамах культуры і клубах, ажыццяўляць кантроль над праходжаннем практыкі. Але сёння сітуацыя ў параўнанні з мінулымі гадамі адрозніваецца тым, што спецыялісты на месцах, дзе мы выбіраем базы практык, пакідаюць гэтую работу. Студэнты-практыканты аказваюцца сам на сам з вучнем ці з групай вучняў без падтрымкі спецыяліста, а колькасць гадзін педагога, які вядзе практыку ў ВНУ, вельмі малая, каб аказваць дзейсную і рэальную дапамогу. На IV курсе студэнты (у большасці выпадкаў) не зусім сфарміраваліся як педагогі-выкладчыкі. Некаторыя методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін ім яшчэ не чыталіся. Таму, на мой погляд, перш чым уносіць якія-небудзь прапановы па правядзенні практыкі, неабходна прывесці ў адпаведнасць вучэбныя планы. Менавіта дысцыпліны, звязаныя з методыкай выкладання, неабходна чытаць да пачатку праходжання практыкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ